1. "Давай, пазванкі яму ламай!" Расійскія найміты знялі на відэа, як забілі сірыйскага дэзерціра // Наша Ніва [электронны рэсурс]. 2019, 21 лістапада. Рэжым доступу: https://nashaniva.by/?c=ar&i=241517. – Дата доступу: 09.09.2020.
2. "У вёсках больш не садзяць градак, бо пенсіі ад 600 еўра". Польшча вачыма беларуса з-пад Нясвіжа // Наша Ніва [электронны рэсурс]. 2019, 9 лістапада. Рэжым доступу: https://nashaniva.by/?c=ar&i=240681. – Дата доступу: 10.09.2020.
3. Facebook і Instagram забароняць "юрлівыя" эмодзі // Звязда [электронны рэсурс]. 2019, 2 лістапада. Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/be/news/20191030/1572448438. – Дата доступу: 09.09.2020.
4. Азаранка няма ў старт-лісце на Australian Open // SPUTNIK [электронны рэсурс]. 2019, 11 снежня. Рэжым доступу: https://bel.sputnik.by/sport/20191211/1043456331. – Дата доступу: 09.09.2020.
5. Дзяцей выхоўвае вуліца ці інтэрнэт: Лукашэнка выказаўся аб адукацыі // SPUTNIK [электронны рэсурс]. 2019, 4 снежня. Рэжым доступу: https://bel.sputnik.by/society/20191204/1043394363. – Дата доступу: 06.09.2020.
6. Жыхар Мінска дамагаўся ад начальніка заробку пры дапамозе малатка // Звязда [электронны рэсурс]. 2019, 17 лістапада. Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/be/news/20191117/1573971291. – Дата доступу: 07.09.2020.
7. Леонтьев, А.А. Психология общения / А.А. Леонтьев. – М., 1996. – 274 с.
8. Сёння – Міжнародны дзень энергазберажэння // Звязда [электронны рэсурс]. 2019, 11 лістапада. Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/be/news/20191111/1573477871. – Дата доступу: 07.09.2020.
9. Студэнт з Горак скраў машыну ў Оршы, каб не спазніцца на заняткі, і абсыпаў салон перцам // Звязда [электронны рэсурс]. 2019, 29 кастрычніка. Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/be/news/20191029/1572358337. – Дата доступу: 08.09.2020.
10. Студэнты журфака БДУ будуць вывучаць дрон-журналістыку// Звязда [электронны рэсурс]. 2019, 6 лістапада. Рэжым доступу: http://www.zviazda.by/be/news/20191105/1572970962. – Дата доступу: 7.09.2020.
11. Эма Уотсан: "Я шчаслівая быць незамужняй. І называю гэта – сама сабе партнёр// Наша Ніва [электронны рэсурс]. 2019, 11 лістапада. Рэжым доступу: https://nashaniva.by/?c=ar&i=240596. – Дата доступу: 10.09.2020.

## СЕМАНТЫЗАЦЫЯ ПРЫРОДЫ Ў МОВЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ НІЛА ГІЛЕВІЧА

***Марозава А.А.,***
*студэнтка 4-га курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Дзядова А.С.,** канд. філал. навук, дацэнт*

У беларускай літаратуры Ніл Гілевіч з'яўляецца агульнапрызнаным майстрам паэтычнага слова, якое ён умее шанаваць і беражліва адносіцца да яго, вяртаць яму рэальную першародласць гучання і сэнсу. Адметнасць паэзіі Ніла Гілевіча выяўляецца ў яе сапраўднай народнасці. Як адзначае Г.Д. Сіненка, "народнасць не проста арганічная ўласцівасць таленту Ніла Гілевіча, гэта – сапраўдная сутнасць яго натуры, яго духоўнага свету" [2, с. 215]. Актуальнасць тэмы нашага даследавання абумоўлена неабходнасцю вывучэння моўных асаблівасцей мастацкіх твораў у гісторыка-культурным аспекце, што з'яўляецца адной з прыярытэтных задач сучаснай лінгвістыкі.

Мэта артыкула – выявіць, праз якія моўныя адзінкі рэпрэзентуецца паняцце "прырода" ў мове паэзіі Ніла Гілевіча, і вызначыць лінгвакраіназнаўчую спецыфіку іх семантыкі.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праведзена на матэрыяле паэтычных твораў Ніла Гілевіча [1]. Асноўнымі метадамі даследавання выступаюць апісальны метад і метад сістэмнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На светапогляд любога паэта, безумоўна, аказвае ўплыў менавіта тое месца, дзе ён нарадзіўся, рос і сталеў. Захапленне Ніла Гілевіча незвычайным хараством і непаўторнасцю роднай прыроды пачалося ў дзяцінстве. Ён вельмі любіў родны край, і гэта аказала пасля значны ўплыў на яго творчасць.

Паэзія Н. Гілевіча выступае невычэрпнай крыніцай ведаў пра асаблівасці беларускай прыроды. Лінгвакраіназнаўчая адметнасць яго твораў выразна выяўляецца праз лексічныя адзінкі, якія ў сваёй семантыцы даволі поўна і глыбока рэпрэзентуюць змест паняцця "прырода".

Рэпрэзентацыя навакольнага асяроддзя і роднай беларускай прыроды ў моўнай тканіне паэтычных твораў аўтара адбываецца праз лексічныя адзінкі і моўныя сродкі рознага семантычнага напаўнення. Паэт-публіцыст часта наведваўся ў Віцебск, які яму настолькі спадабаўся, што ён прысвяціў гэтаму гораду наступныя радкі: "Я хачу вярнуцца ў той вечар ліпнёвы на Віцебшчыне, / У той водсветак маланак, пад гулкі захлёбісты лівень, / У той водар садоў, да лісцінкі абмытых і вычышчаных, / У абдымкі тых рук, і даверлівых і палахлівых!" [1, с. 50]. У гэтых радках праз выкарыстанне словазлучэнняў вечар ліпнёвы, водар садоў, а таксама эпітэтаў гулкі захлёбісты лівень; абмытых і вычышчаных садоў выказваецца захапленне аўтара нашым горадам, улюбёнасць у яго.



Репозиторий ВГУ

Н. Гілевіч, як вядома, нарадзіўся ў вёсцы Слабада Мінскай вобласці, непадалёку ад якой знаходзіцца возера Нарач. Нарач – гэта самае вялікае возера на тэрыторыі Беларусі. Будучы паэт быў у захапленні ад яго прыгажосці і веліччы, пра што сведчаць наступныя радкі: "З азёр дзівосных бачыў я нямала, / І калі чуў, як гучна славяць іх, / Мяне часамі крыкнуць падмывала: / "А вы да нас загляньце хоць на міг!" [1, с. 89]; "Да хваль тваіх, і соснаў, і бяроз / Вяртаўся ў думках я не раз, бывала, / Калі без родных вечаровых рос / Мая душа, засмягшы, вандравала" [1, с. 93]; "Што я наважыў одумам сваім – / Я паўтару сабе як клятву, нанач. / А покуль што стаю ў цішы хваін / І слухаю тваё дыханне, Нарач" [1, с. 88]. Уменне бачыць незвычайную, першародную прыгажосць возера, непадробная любоў да яго, усхваляванасць і ўзрушанасць аўтара – усё гэта перадаецца праз выкарыстанне эпітэтаў азёр дзівосных, вечаровых рос, а таксама выразаў крыкнуць падмывала, стаю ў цішы, вяртаўся ў думках, душа вандравала. Як адзначае сам майстар слова, ён ганарыцца гэтым скарбам прыроды, і гэтыя мясціны не даюць забыць яму гісторыю сваёй Радзімы:"Ты мне забыцца не дасі нідзе, / Адкуль я, хто і чым вядомы продкі. / Ці ў шчасці я, ці ў смутку, ці ў бядзе – / Мне да цябе заўсёды шлях кароткі" [1, с. 92]; "Я рад, што сэрцам да цябе прырос, / Да хваль тваіх, і соснаў, і бяроз, / Што звеку ты ў маіх вачах сінела" [1, с. 94] і інш.

Як узгадвалася вышэй, паэт вельмі любіў сціплую, някідкую прыгажосць роднага краю, захапляючыся ім у любую пару года – летам ці ўзімку, вясной ці восенню: "Замірае, / Сціхае / Мая залатая дуброва, / Асыпае, / Скідае на дол, / Свой задумлівы ўбор" [1, с. 103]; "А нядаўна ж яшчэ – / На пачатку нядоўгага лета – / Што рабілася тут, / Што за дзіўнае свята было! / Як усё бушавала, / Буяла лістотай і цветам! / Як усё гаманіла, / Спявала, / Гукала, / Гуло!" [1, с. 103]. Усё сваё жыццё Ніл Гілевіч быў сапраўдным патрыётам сваёй краіны. З гонарам за сваю Бацькаўшчыну і шчырай любоўю да яе творца заяўляе: "Дыхнула свежасцю – і лёгка стала, / Пачуўся лесу пошум, плёскат рэк… / Мой родны край, мая зямля спявала, / Мая любоў, адзіная навек!" [1, с. 24].

У сваіх вершах Ніл Гілевіч разглядае прыроду як неацэнны скарб беларускай зямлі, які мы павінны берагчы, каб перадаць будучым пакаленням, што прыйдуць пасля нас :"Углядаюся зноў у прастор – / У мілыя, родныя вобразы / Любага краю. / Без гэтых бароў задуменных, / Без гэтых азёр, / Без гэтых палеткаў / Я шчасця на свеце не знаю" [1, с. 56]; "Дзе ў далёкіх маіх вандроўках / Я не сніў аб Радзіме сны – / Паўставалі ў іх зноў і зноўку: жыта, сосны, валуны" [1, с. 57]; "Угледзіш – і шчасцем асвеціцца бор! / Але праз секунду-другую – / З усмешкаю горкай саб'еш мухамор / Ці порхаўку стопчаш рудую" [1, с. 186], дзе праз прыём адухаўлення рэалізуецца думка пра адзінства чалавека і прыроды.

Між тым негатыўнае стаўленне да людзей, якія знішчаюць прыроднае багацце роднага краю, семантызуецца ў мове наступнага паэтычнага кантэксту, у якім аўтар просіць прабачэння ў прыроды за жорсткае абыходжанне і безразважныя адносіны да яе: "Ламаў вам рукі варвар, / рэбры трушчыў, / Смаліў агнём, жалезамі крамсаў… / Даруйце, родныя бары і пушчы: / Не ведаў я, што з вамі гіну сам" [1, с. 154], дзе дзеялоўныя метафары ламаў рукі, трушчыў рэбры, смаліў агнём і інш. ужыты са значэннем 'знішчаў, ліквідаваў'.

Выключна важнае месца ў творчасці Ніла Гілевіча займаюць яго ўспаміны пра дзяцінства, якое было праведзена сярод лясоў і палёў на ўлонні надзвычай прыгожай і сціплай беларускай прыроды: "У край маленства памяць адбягае. / І тчэ і тчэ старую казку ноч, / І ў мутных хмарках месячык мільгае, / Як паміж ніцяў срэбраны чаўнок" [1, с. 152]; "Забуду музыкантаў хвалёных, / Але й прад смерцю прыгадаю зноў – / Далёка ў полі, на пагорках варненскіх, / Язычаскія скрыпкі цвыркуноў" [1, с. 122]. У даследаваным моўным матэрыяле праз выкарыстанне эпітэтаў у мутных хмарках, срэбраны чаўнок, старую казку, язычаскія скрыпкі, а таксама метафар памяць адбягае, тчэ казку, месячык мільгае перадаецца кантрасны малюнак навакольнага асяроддзя.

**Заключэнне.** Такім чынам, у прааналізаваных намі паэтычных творах Ніла Гілевіча, праз мову якіх адбываецца семантызацыя паняцця "прырода", рэпрэзентуецца разнастайная лінгвакраіназнаўчая інфармацыя пра Беларусь і яе прыроднае асяроддзе, а таксама гістарычнае мінулае нашага краю.


1. Гілевіч, Н. Выбраныя творы: У 2 т. Т.1. Вершы, паэмы, п'есы / Н. Гілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 478с.
2. Сіненка, Г.Д. Ніл Гілевіч: нарыс творчасці / Г.Д. Сіненка. – Мінск: Вышэйш. шк., 1981. – 269 с.


Репозиторий ВГУ